**Г.М. Канцавая (Брэст)**

# ТЭКСТ ЯК КЛЮЧАВАЯ АДЗІНКА КУРСА РОДНАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

У падручніках «Беларуская мова» для пачатковых класаў рэалізуецца лінгваметадычны прынцып, згодна якому моўная адукацыя вучняў і іх маўленчае развіццё ажыццяўляюцца ва ўзаемасувязі. Дасягаецца гэта шляхам уключэння ў падручнік разнастайных тэкстаў, сярод якіх вылучаем: 1) вучэбныя тэксты параграфаў, у якіх тлумачацца з’явы і факты лінгвістычнага характару, даецца азначэнне паняццяў, пералічваюцца прыметы з’яў, выкладаецца правіла; 2) вучэбныя тэксты, якія цесна звязаны з тэарэтычнай часткай параграфа і гучаць ад імя «спадара» ці «спадарыні»; 3) вучэбныя тэксты практыкаванняў, што выступаюць у якасці дыдактычнага матэрыялу; 4) заданні да практыкаванняў як асобы від тэксту; 5) вучэбныя тэксты пераказаў.

Тэксты параграфаў уключаюць тыя лінгвістычныя з’явы і факты, якія адпавядаюць узроставым асаблівасцям малодшых школьнікаў і з’яўляюцца асновавызначальнымі для больш глыбокага вывучэння роднай мовы ў наступных класах. Азначэнні, пададзеныя ў тэкстах параграфаў, будуюцца на аснове мінімальнай колькасці прымет, але гэтыя прыметы дастатковыя для таго, каб адрозніць адно паняцце ад другога. У час працы з вучэбнымі тэкстамі параграфаў пачаткоўцы авалодваюць навуковай мовай падручніка.

Вучэбныя тэксты, якія цесна звязаны з тэарэтычнай часткай параграфа, невялікія па аб’ёме, у большасці сваёй выкладзены цікава, лёгка ўспрымаюцца вучнямі пачатковых класаў.

Тэксты пераказаў адпавядаюць педагагічным і метадычным патрабаванням, садзейнічаюць фарміраванню нормаў літаратурнай мовы, садзейнічаюць паляпшэнню індывідуальнага стылю маўлення школьнікаў. Такія тэксты, як правіла, вызначаюцца дасканалай лексічнай, граматычнай і стылістычнай арганізацыяй, дакладнай логікай паведамлення.Праца з тэкстамі пераказаў, змешчанымі на старонках падручнікаў па роднай мове, накіравана на свядомае засваенне вучнямі прачытанага, правільнае разуменне частак і ўзаемасувязі паміж імі, асэнсаванне моўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для раскрыцця тэмы.

Заданні да практыкаванняў – гэта асобы від тэксту, ад асэнсавання якога залежаць правільнае і дакладнае іх выкананне. Паміж заданнямі практыкавання існуе пэўная сувязь. Гэта адзінае цэлае, усвядомленае ўспрыманне якога дапамагае вучням правільна дзейнічаць на этапе фарміравання і ўдасканалення тых ці іншых навыкаў.

Тэкст выступае ў большасці практыкаванняў у якасці дыдактычнага матэрыялу. Вучэбныя тэксты практыкаванняў разлічаны на асэнсаванне

лінгвістычнай сутнасці тых ці іншых моўных з'яў і паняццяў, засваенне навуковых спосабаў дзеяння пры аналізе моўных з'яў, выяўленне канкрэтных моўных адзінак, на выпрацоўку уменняў і навыкаў правільнага карыстання набытымі ведамі. Праца са звязнымі тэкстамі практыкаванняў дае магчымасць настаўніку арганічна звязаць матэрыял новай тэмы з паўтарэннем, абагульненнем вывучанага раней, так як тэкст – гэта сфера функцыянавання моўных адзінак розных узроўняў.

Працэс адбору дыдактычнага матэрыялу для практыкаванняў, яго змест адпарадкаваны пэўным прынцыпам: 1) прынцыпу тэматычнай арганізацыі тэкставага матэрыялу, яго актуалізацыі. Тэматычна арганізаваны матэрыял дае магчымасць больш поўна рэалізаваць светапоглядны патэнцыял прадмета «Беларуская мова». Прынцып актуалізацыі прадугледжвае рэалізацыю патрабавання сувязі навучання з жыццём; 2) прынцыпу лагічнай сувязі з мэтамі вывучэння моўнай з'явы, які прадугледжвае адбор такога матэрыялу, што дазваляе самым эканомным спосабам раскрыць сутнасць вывучаемай катэгорыі, абумоўлівае выбар такіх прыёмаў працы з ім, якія пры мінімальнай затраце часу актывізуюць пазнавальную актыўнасць малодшых школьнікаў; 3) прынцыпу ўліку спецыфікі вывучаемай моўнай з'явы. Напрыклад, вывучэнне аднародных членаў сказа арганічна ўключае ў сябе інтанаванне як дзейсны кампанент ўспрымання і запамінання матэрыялу і ўмення яго выкарыстоўваць. Увага настаўніка пры чытанні тэкстаў да правільнага інтанавання аднародных членаў сказа палягчае пачаткоўцам набываць веды; 4) прынцыпу рэалізацыі міжпрадметных сувязяў пры адборы матэрыялу і працы з ім. Напрыклад, выразнае чытанне тэксту, у якім ужыты аднародныя члены сказа, адначасова выступае як сродак правільнага авалодання сінтаксічнай катэгорыяй і як сродак, які выхоўвае чытацкую культуру. Урокі мовы разам з урокамі літаратурнага чытання вырашаюць задачу выхавання граматнага чытача, які адчувае слова.

Звязныя тэксты практыкаванняў дазваляюць на кожным уроку працаваць і над развіццём маўлення. Перш за ўсё вучні вучацца ўспрымаць тэкст. Гэтай мэтай тлумачыцца той факт, што большасць практыкаванняў пачынаецца з задання «Прачытайце». Пасля гэтага нярэдка ідуць заданні, звязаныя з вызначэннем тэмы тэксту («На якую тэму гэты тэкст?», «Якая яго асноўная думка?», «Дайце тэксту загаловак»). Заданні, звязаныя з арганізацыяй чытання, садзейнічаюць развіццю вельмі важных агульнавучэбных уменняў: дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, вызначаць сувязі паміж імі, устанаўліваць прычынныя сувязі паміж фактамі і з'явамі мовы і маўлення, арыентавацца ў тэксце, пераказваць яго з улікам пастаўленай задачы, вызначаць лагічную структуру тэксту. Правільнае ўспрыманне тэксту стварае аснову для асэнсавання ўспрымання ўсіх іншых заданняў, напрыклад, спісвання тэксту, яго ўзнаўлення ў выглядзе адказу на пытанні і г.д.

Змешчаныя ў падручніку тэксты і заданні да іх даюць магчымасць настаўніку ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход у навучанні: заданні ў іх рознай ступені цяжкасці і рознага аб'ёму. Змест тэкстаў і заданняў дазваляе настаўніку вар'іраваць іх выбар у залежнасці ад падрыхтаванасці класа, ад спецыфікі вучэбнага матэрыялу, мэтаў урока. Такім чынам ствараюцца ўмовы для рэалізацыі асобасна арыентаванана падыходу ў навучанні і выхаванні малодшых школьнікаў.

Зыходзячы з таго, што вучэбны тэкст на ўроках роднай мовы служыць асновай для стварэння не толькі вучэбнага, але і развіццёвага маўленчага асяроддзя, накіраванага на эстэтычнае развіццё асобы, уяўляецца асабліва важным тое, што ў падручніку прапануюцца розныя па змесце тэксты. Для сучаснага школьніка асабліва важныя тэксты, якія выклікаюць добрыя пачуцці, даюць магчымасць дзіцяці адчуць сябе ў гармоніі з навакольным светам. Многія тэксты вучаць любіць Радзіму, паважаць яе культуру, беражліва адносіцца да слова, садзейнічаюць узбагачэнню слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў і развіццю іх пазнавальных здольнасцяў. Аналіз такіх тэкстаў – пачатак вялікай і мэтанакіраванай працы па фарміраванні ў вучняў пачуцця мовы, каштоўнасных арыентацый, звязаных з роднай мовай. Такія тэксты даюць магчымасць паказаць лексічнае багацце мовы, звярнуць увагу на ключавыя словы тэксту, на тыпалагічныя прыметы апавядання, апісання, разважання і г.д. Адным словам, сам па сабе факт шырокага выкарыстання тэкстаў у падручніку стварае для настаўніка магчымасць сістэматычна працаваць над развіццём звязнага маўлення.

У якасці дыдактычнага матэрыялу прапануюцца часцей за ўсё звязныя тэксты з твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, а таксама выкарыстаны творы беларускай народнай творчасці: прымаўкі, прыказкі, загадкі, тэксты з беларускіх народных казак. Змешчаныя ў падручніках па беларускай мове для пачатковых класаў тэксты адпавядаюць узроўню ўспрымання і асэнсавання вучнямі навакольнай рэчаіснасці і такім чынам удзельнічаюць у фарміраванні паняційнай карціны свету. Як вядома, дзеці апошнім часам мала чытаюць, таму наяўнасць у падручніку ўзорных тэкстаў дапамагае на ўроках роднай мовы кампенсаваць тое, што не заўсёды забяспечваюць урокі літаратурнага чытання.

Такім чынам, разнастайныя вучэбныя тэксты падручнікаў па беларускай мове для пачатковых класаў выступаюць у якасці асноўнай, ключавой адзінкі курса роднай мовы. Праца з тэкстамі з улікам іх асаблівасцяў на розных этапах урока накіравана на фарміраванне лінгвістычнай, моўнай і камунікатыўнай кампетэнцый малодшых школьнікаў.